

# Змітрок Бядуля

(1886-1941)

# Гады маленства




- Змітрок Бядуля, сапраўднае імя: Самуіл Яфімавіч Плаўнік нарадзіуся 23 красавіка 1886 г. вёска Пасадзец потым у Лагойскім р-н Мінскай вобл.) Псеўданімы: Саша Пл-ік; Ясакар; Зьмітро Бядуля) — беларускі паэт і празаік . Нарадзіўся ў небагатай яўрэйскай сям'і. Бацька яго быў арандатарам, дробным гандляром, любіў музыку — іграў на скрыпцы. Дзед, адзіны ў мястэчку каваль і меднік, меў уласную бібліятэку. Вучыўся ў пачатковай яўрэйскай школе — хедары, у школе рабінаў — ешыбоце. Ведаў іўрыт — старажытнаяўрэйскую мову, ідыш, нямецкую, беларускую, рускую і крыху польскую мовы.

Яшчэ хлопчыкам З. Бядуля складаў вершы на старажытнаяўрэйскай мове, але пачаткам яго літаратурнай дзейнасці лічыцца 1907, калі ён пачаў пісаць вершы на рускай мове і пасылаць іх у пецярбургскія часопісы.

Першы мастацкі твор будучага пісьменніка ўбачыў свет у газеце «Наша Ніва».

# Творчая дзейнасць

У 1912 г. Бядуля пераехаў у Вільню, працаваў у канторы лесапрамыслоўца, затым у рэдакцыі «Нашай Нівы» разам з Янкам Купалам. Апавяданні, напісаныя Змітраком Бядуляй ў тыя гады, сталі класікай беларускай літаратуры.

Да ранняй лірыкі З. Бядулі прымыкае яго першы зборнік імпрэсіяністычных замалёвак «Абразкі» (1913), якія толькі адсутнасцю рыфмы адрозніваюцца ад вершаў. У большасці сваіх імпрэсій пісьменнік звяртаўся да прыроды, імкнуўся супрацьпаставіць убогаму вясковаму жыццю яе вечна маладую, зменлівую прыгажосць. Сапраўднай класікай у гісторыі беларускай літаратуры сталі апавяданні З. Бядулі, напісаныя ў гэтыя ж гады: «Пяць лыжак заціркі» (1912), «Маладыя дрывасекі» (1914), «На каляды к сыну» (1913), «Велікодныя яйкі» (1913), «Летапісцы» (1914).





Летам 1915 г. з Вільні вярнуўся ў в. Пасадзец, а неўзабаве пераехаў у Мінск, дзе працаваў у беларускім бежанскім камітэце. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі некалькі год працаваў у газеце «Савецкая Беларусь» і інш. газетах, быў рэдактарам дзіцячага часопіса «Зоркі». У 1923 яны ўвайшлі ў першую кнігу апавяданняў З. Бядулі «На зачараваных гонях». У гэтых апавяданнях пісьменнік малюе тагачаснае цяжкае вясковае жыццё, часта без надзеі на будучае. Героі многіх апавяданняў — дзеці, якія галадаюць, не маюць магчымасці развіваць свае здольнасці .

У 1926 г. пачаў працаваць у Інстытуце беларускай культуры, рэдагаваў краязнаўча-этнаграфічны часопіс «Наш край». Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», пасля — ва «Узвышша». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся з Беларусі. Сябра СП СССР з 1934 г.

- Для дзяцей выдадзены кнігі «Качачка-цацачка» (1927, казка), «Вясной» (1928, вершы), «Гаспадарка» (1930, вершы), «Мурашка-Палашка» (1939, вершаваная казка), «Люцік» (1940, верш), «Хлопчык з-пад Гродна» (1940, паэма). Выдаў даследаванне «Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных казках і песнях» (1924), кнігу нарысаў «Дзесяць» (1930). Пераклаў з іўрыта на беларускую мову аповесць Шолама-Алейхема «Хлопчык Мотка» (1930), раман С. Годынэра «Чалавек з вінтоўкай» (1933), кнігу С. Каган «Апавяданні» (1940), паасобныя вершы Т. Шаўчэнкі, Ю. Будзяка. Шмат твораў і зборнікаў выйшлі пасля смерці і ў пасляваенныя гады: «Апавяданні» (1947), «Мае забавы» (1949, вершы), «Сярэбраная табакерка» (1958, казка і апавяданні), «Дзень добры!» (1979, вершы, казкі, апавяданні), асобныя вершы, казкі. У 1951—1953 гг. выйшаў збор твораў у 4-х, у 1985—1989 — у 5 тамах.





У 1920-1930-я З. Бядуля працягваў літаратурную дзейнасць. Цяпер малавядомыя ваяцкія песні і патрыятычныя вершы, уключаныя ў зборнік «Пад родным небам» (1922), якія пазней не друкаваліся. Гэта публіцыстычныя, грамадзянскія вершы-заклікі, санеты патрыятычнага гучання. У той час З. Бядуля напісаў некалькі паэм: «Беларусь», «У ясных Крушнях», «З сказаў буры і віхуры», «Дзед», у якіх супрацьпастаўляў цяжкае дарэвалюцыйнае жыццё новаму — светламу і шчасліваму.

Пісьменніка цікавіла вусная народная творчасць, міфалогія, этнаграфія, краязнаўства. Як народная легенда была пазначана яго паэма «Госць», напісаная на аснове народнага падання і ўключаная ў зборнік «Паэмы» (1927). Цалкам на этнаграфічным і фальклорным матэрыялах створана паэма З. Бядулі «Ярыла». На фальклоры Палесся напісана паэма «Палескія былі». Пытанням этнаграфіі і фальклору прысвяціў ён шэраг артыкулаў, а ў 1924 выдаў асобную кнігу «Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных песнях і казках».

Адметнай з'явай стала аповесць З. Бядулі «Салавей» (1927), прысвечаная мінуўшчыне, часам прыгоннага права — цікавы, казачна-прыгодніцкі і рамантычны твор, падобнага да яго ў беларускай літаратуры няма. Па матывах аповесці быў пастаўлены балет «Салавей». Пасля гэтай аповесці і адначасова з ёю выходзілі зборнікі апавяданняў З. Бядулі «Апавяданні» (1926), «Дэлегатка» (1928), «Незвычайныя гісторыі» (1931). Благі лёс быў у сацыяльна-псіхалагічнага рамана «Язэп Крушынскі» (1929—1932).

- У кан. 1930-х Змітрок Бядуля напісаў дзве аўтабіяграфічныя аповесці «Набліжэнне» (1935) і «У дрымучых лясах» (1939). Апошнім яго творам стала аповесць-казка «Сярэбраная табакерка» (1940). Упершыню яна цалкам была надрукавана толькі ў 1953 г. У аснове сюжэта аповесці матывы народнай казкі пра тое, як дудар-паляшук паланіў смерць, запазычаныя з фальклорных запісаў А. Сержпутоўскага. З народнай казкі З. Бядуля зрабіў філасофска-павучальную прытчу аб барацьбе дабра і зла, жыцця і смерці.
- Памёр Змітрок Бядуля ў 1941 г.



# Творы Змітрака Бядулі

- Першы надрукаваны твор — імпрэсія на беларускай мове «Пяюць начлежнікі» («Наша ніва», 1910). У 1911—1912 друкаваў вершы на рускай мове ў часопісах «На берегах Невы» (Пецярбург) і «Молодые порывы» (Вільня). У 1913 апублікаваў зборнік лірычных імпрэсій «Абразкі» (Пецярбург). У паслярэвалюцыйны час выйшлі кнігі паэзіі «Пад родным небам» (1922), «Буралом» (1925), «Паэмы» (1927), зборнікі апавяданняў «На зачарованых гонях» (1923), «Апавяданні» (1926), «Выбраныя апавяданні» (1926), «Танзілія» (1927), «Дэлегатка» (1928), «Тры пальцы» (1930), «Незвычайныя гісторыі» (1931), «Па пройдзеных сцежках» (1940), аповесці «Салавей» (1928, экранізавана і пастаўлена ў 1937, аднайменны балет у 1939), «Набліжэнне» (1935), «У дрымучых лясах» (1939, часопіс «Полымя»), двухтомны раман «Язэп Крушынскі» (1929—1932), «Выбраныя творы» (1934).



# Дзякуй за увагу!